# Дысцыпліна і яшчэ раз — дысцыпліна

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка разгледзеў кадравыя пытанні. Цяпер у Беларусі новыя кіраўнік Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, намеснікі міністраў інфармацыі, адукацыі і ЖКГ, старшыні райвыканкамаў, паслы, кіраўнік прадпрыемства.**

Калі гутарка ішла пра кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, беларускі лідар загадаў ім рыхтавацца да ўборачнай з улікам страт ад засухі. Ён са шкадаваннем адзначыў яе наступствы. «Але гэтыя дажджы крыху выправілі сітуацыю, а ў вас (**«Зв».** — на ўсходзе краіны) там наогул пасевы вельмі добрыя. Трэба сур'ёзна рыхтавацца, каб іх убраць. Таму што карміць будзеце ўсю краіну. Калі такое было, каб поўнач і паўночны ўсход забяспечвалі Беларусь. Ну і яшчэ поўнач Мінскай вобласці. Таму трэба звярнуць асаблівую ўвагу і падрыхтавацца да ўборкі», — даручыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама яшчэ раз нагадаў аб важнасці правільнай работы з кадрамі, падтрымання вытворчай дысцыпліны. Дастойных работнікаў трэба забяспечыць працоўным месцам, добра іх арганізаваць. «Парадак і тэхналагічная дысцыпліна, як і вытворчая дысцыпліна наогул, — гэта пытанні нумар адзін. Стаўцеся вельмі строга да гэтых праблем. І не глядзіце па баках. Вы адказваеце за канкрэтную тэрыторыю. І там з вас запатрабуюць. У вас няма ні прыватных, ні дзяржаўных прадпрыемстваў. У вас там ёсць кіраўнікі і людзі, якім трэба забяспечыць іх галоўныя правы: на працу, зарплату, жыццё, ахову здароўя, адукацыю і гэтак далей», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Шмат пытанняў узнікла ў кіраўніка дзяржавы і да новага намесніка старшыні Мінскага аблвыканкама. Асобна Прэзідэнт звярнуўся да Аляксандра Гучка, які цяпер — старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі. «Вы ведаеце, чым займацца і як. Прынцыповасць, сумленнасць, шчырасць. І недапушчальнасць рознага роду супрацьпраўных дзеянняў. Не дай бог карупцыя ці якія штосьці. На злобу дня — вы бачыце, што адбываецца ў краіне. Літасці ў гэтым плане нікому не будзе. Гэта датычыцца ўсяго кіруючага саставу», — падкрэсліў беларускі лідар.

**Кіраўнік дзяржавы назначыў:**

**БРЫЛЯ Вячаслава Станіслававіча** — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Рэспубліцы Нігерыя і па сумяшчальніцтве ў Рэспубліцы Гана і Рэспубліцы Камерун;

**ГУЧКА Аляксандра Яўгенавіча** — старшынёй Вышэйшай атэстацыйнай камісіі.

**Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:**

**РАГАШЧУКА Мікалая Міхайлавіча** — намеснікам старшыні Мінскага аблвыканкама;

**ШЧУПЛЯНКОВА Анатоля Леанідавіча** — старшынёй Бялыніцкага райвыканкама;

**БАРТАШЭВІЧА Івана Мікалаевіча** — старшынёй Круглянскага райвыканкама;

**ПЯТРУШЫ Дзмітрыя Віктаравіча** — кіраўніком адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска;

**ШВЕДА Аляксея Дзмітрыевіча** — генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у г. Стамбул (Турэцкая Рэспубліка);

**ТРУБІЛЫ Генадзя Аляксеевіча** — першым намеснікам міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

**СМІРНОВА Віталя Аляксеевіча** — намеснікам міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

**БУЗОЎСКАГА Ігара Іванавіча** — намеснікам міністра інфармацыі;

**СТАРАВОЙТАВАЙ Ірыны Анатолеўны** — першым намеснікам міністра адукацыі;

**КАРПЯКА Уладзіміра Валянцінавіча** — генеральным дырэктарам ААТ «Белшына».

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# СУСЕДЗІ БЛІЗКІЯ І ДАЛЁКІЯ

**З чатырох частак свету ў нашу краіну прыбылі новыя паслы. Польшча, Італія, М'янма, Пакістан, Узбекістан — гэта далёка не ўвесь спіс краін, чые дыпламаты чакалі моманту ўручэння даверчых грамат Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку.**

Вітаючы дыппрадстаўнікоў, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што яны прыехалі ў сучасную, бяспечную для жыцця і зручную для вядзення бізнесу еўрапейскую дзяржаву, якая дынамічна развіваецца. Беларускі лідар адзначыў, што наша краіна валодае моцнай прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, значным навуковым патэнцыялам і кваліфікаванымі кадрамі. Адной з найбольш перспектыўных галін айчыннай эканомікі з'яўляецца IT-сфера. «Па шэрагу кірункаў мы ўжо занялі лідзіруючыя пазіцыі ў рэгіёне», — адзначыў Прэзідэнт.

Акрамя таго, высокатэхналагічнымі кампаніямі свету праяўлены інтарэс да Парка высокіх тэхналогій, індустрыяльнага парка «Вялікі камень» і іншых інавацыйных пляцовак, якія ёсць ва ўсіх абласцях. Яны ператвараюцца ў цэнтры прыцягнення інвестыцый. Да таго ж Беларусь — выключна мірная краіна. «Мы добра памятаем урокі мінулага. Клапатліва ставімся да сучаснасці. Удумліва — да будучыні нашай Айчыны. Таму асноўнай характарыстыкай нацыянальнай знешняй палітыкі з'яўляецца міралюбства. У гэта слова ўкладаюцца такія паняцці, як шматвектарнасць, збалансаванасць, прагматычнасць і паслядоўнасць. Наша краіна выступае за шырокі дыялог па ўсіх міжнародных пытаннях. Мы высока цэнім шчырасць, адкрытасць, паважлівае стаўленне да нас і гатовы адказваць узаемнасцю», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Сёлета споўнілася 25 гадоў з дня ўсталявання дыпламатычных адносін з Узбекістанам. «Мы даражым вузамі дружбы, якія звязваюць беларускі і ўзбекскі народы. Вітаем рашэнне нашага шматгадовага партнёра адкрыць у Мінску паўнавартаснае дыпламатычнае прадстаўніцтва. Гэта важны і своечасовы крок, які дэманструе накіраванасць на ўсебаковае паглыбленне дыялогу», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

У размове з журналістамі пасол Узбекістана ў Беларусі Насірджан Юсупаў пацвердзіў, што ўжо ідзе падрыхтоўка да вераснёўскага візіту Аляксандра Лукашэнкі ў яго краіну. «Мы працуем над тым, каб гэты візіт на высокім узроўні паспрыяў рэалізацыі сумесных праектаў у далейшым. У цэлым мы зацікаўлены ў развіцці супрацоўніцтва з Беларуссю», — падкрэсліў ён.

Як заўважыў беларускі лідар, выбудоўванне сапраўды добрасуседскіх і раўнапраўных адносін з Польшчай — адна з прыярытэтных задач айчыннай дыпламатыі. «Польшча — наш сусед. Суседзяў не выбіраюць. Нас збліжаюць не толькі сумесная мяжа, эканамічнае супрацоўніцтва, міжасабовыя кантакты, але і агульная адказнасць за стабільнасць і бяспеку ў рэгіёне», — упэўнены Прэзідэнт. На яго думку, неабходна надаць гэтаму ўзаемадзеянню ўстойлівы і паслядоўны характар, і нашы краіны да гэтага гатовыя.

Пасол Рэспублікі Польшча ў нашай краіне Артур Міхальскі падзяліўся найбліжэйшымі планамі ў рабоце: «У нашых адносінах ёсць шмат станоўчых перадумоў. Галоўнае — мы суседзі. З гэтага трэба сыходзіць і надалей паглыбляць супрацоўніцтва. Для нас важны эканамічны бок стасункаў. Да таго ж людзі павінны ведаць адзін аднаго, разам гандляваць, абменьвацца меркаваннямі. Таму мы гатовы садзейнічаць народнай дыпламатыі, наладжванню кантактаў паміж рознымі групамі людзей».

Гады паспяховага супрацоўніцтва па шырокім спектры кірункаў звязваюць Беларусь і з Італіяй. Тым больш, што ў дзвюх дзяржаў заўжды атрымлівалася вырашаць любыя задачы ў атмасферы адкрытасці і даверу. «Пераканаы, што актыўны палітычны дыялог, рэалізацыя сумесных эканамічных праектаў, узаемадзеянне ў культурнай і навуковых сферах цалкам адпавядаюць інтарэсам нашых народаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пасол Італіі Марыя Джорджа Стэфана Бальдзі са шчырай усмешкай дзеліцца першымі ўражаннямі ад нашай краіны. Для яе галоўнае — добрыя адносіны паміж нашымі народамі. І ён гэта выразна адчувае, калі, напрыклад, пачынае размаўляць па-італьянску на нашых вуліцах: беларусы ўсміхаюцца ёй у адказ. «Спадзяюся, атрымаецца захаваць тую ж рэпутацыю на працягу ўсёй місіі ў Мінску», — адзначыў ён. Дыпламат нагадаў, што за апошнія дзесяцігоддзі больш за паўмільёна беларускіх дзяцей наведала Італію па гуманітарнай лініі. Цяпер яны выраслі і сталі своеасаблівым падмуркам у міжасабовых кантактах Беларусі і Італіі.

Наша краіна будзе развіваць адносіны і з іншымі еўрапейскімі дзяржавамі.

«Мы зацікаўлены ў развіцці адносін з Кіпрам па ўсіх пытаннях двухбаковага і глабальнага парадку дня. У нас ужо дасягнуты неблагія паказчыкі ў гандлі паслугамі. Прыйшоў час падумаць над сумеснымі праектамі ў банкаўскай справе, у сферах інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і турызму. Рэзервы для гэтага ёсць», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

Пасол Кіпра ў Беларусі Леанідас Маркідзіс лічыць, што паміж нашымі краінамі ўжо створаны падмурак адносін, і цяпер задача — пачаць супрацоўнічаць больш шчыльна. «Мая задача як пасла на тэрмін, што я буду працаваць у Беларусі, — вывесці нашы стасункі, і не толькі эканамічныя, на новы ўзровень», — дзеліцца глабальнымі планамі дыпламат.

Беларускі лідар з радасцю вітаў у зале паслоў з краін Азіі, Лацінскай Амерыкі і Афрыкі. Па яго словах, узаемадзеянне з гэтымі дзяржавамі ўяўляе для Беларусі асаблівы палітычны і безумоўна эканамічны інтарэс, таму што на базе гандлю і эканомікі засноўваюцца любыя адносіны.

Так, у апошнія гады сфарміраваны неабходныя механізмы для прадметнай і поўнафарматнай работы з Пакістанам, падкрэсліў Прэзідэнт. Беларусь чакае паспяховага здзяйснення сумесных праектаў у розных галінах прамысловасці, ахове здароўя і ў падрыхтоўцы кадраў.

Беларусь адкрыта для актывізацыі разнапланавага супрацоўніцтва з Непалам. Маючы значны індустрыяльны і адукацыйны патэнцыял, мы можам аказваць садзейнічанне развіццю гэтай дзяржавы. Наша краіна ўважліва назірае за аднаўленнем М'янмы, якое адкрывае новыя магчымасці і перспектывы.

Адным з ключавых партнёраў Беларусі ў Паўднёвай Амерыцы з'яўляецца Эквадор. Нас збліжаюць сугучныя прыярытэты ўнутранай і знешняй палітыкі, сацыяльна-эканамічнага развіцця. Мы гатовы зрабіць неабходныя крокі для таго, каб двухбаковыя адносіны ў найкарацейшыя тэрміны выйшлі на якасна новы ўзровень.

«Акрэдытацыя ў Беларусі паслоў Замбіі і Конга заклікана дапамагчы знайсці новыя пункты судакранання і надаць адносінам належную дынаміку. Асабліва з улікам узаемадапаўняльнасці нашых эканомік», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Надаваць дынаміку нашым адносінам ужо пачаў Давід Мадука, пасол Рэспублікі Конга ў Расійскай Федэрацыі і па сумяшчальніцтве — у Беларусі. У яго планах — наладзіць пастаўку беларускіх трактароў не толькі ў сваю краіну, але і іншыя дзяржавы Цэнтральнай Афрыкі. Па яго словах, пакуль «Беларусы» ў Конга і іншыя краіны гэтага рэгіёна амаль не пастаўляліся. Не так даўно пасол пабываў на Мінскім трактарным заводзе і вырашыў пасадзейнічаць у арганізацыі паставак. «І гэта толькі першыя планы», — упэўнены журналістаў дыпламат.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

■ Падрабязнасці

# Хто накручваў цэны лекаў

## Камітэт дзяржаўнай бяспекі выкрыў маштабную карупцыйную схему ў сферы аховы здароўя

За сістэматычнае атрыманне хабараў затрыманы шэраг так званых медыцынскіх функцыянераў. У іх ліку дырэктар цэнтра экспертыз і выпрабаванняў у ахове здароўя Аляксандр Сталяроў за вырашэнне пытанняў па дзяржаўнай рэгістрацыі лякарстваў, дырэктар прадпрыемства «Белмедтэхніка» Аляксандр Шарак за арганізацыю заключэння і выканання дагавароў, забеспячэнне своечасовай аплаты і рэалізацыі закупак. «Дарэчы, пры вобыску ў яго гаражы ў тайніку знойдзена больш за $620 тыс. у эквіваленце», — паведаміў **старшыня Камітэта дзяржбяспекі Валерый ВАКУЛЬЧЫК.**

Сярод фігурантаў таксама начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама Андрэй Стрыжак і начальнік ваенна-медыцынскага ўпраўлення Міністэрства абароны Аляксей Яськоў. Першы затрыманы за арганізацыю правядзення тэхнічнага абслугоўвання і рамонту медыцынскага абсталявання, якое знаходзіцца ва ўстановах аховы здароўя Гродна. Другі — за заключэнне дагавораў па пастаўцы медыцынскай тэхнікі і вырабаў медыцынскага прызначэння ў адрас ваенна-медыцынскага ўпраўлення Міністэрства абароны, а таксама арганізацыю і кантроль аплат пастаўленай медыцынскай тэхнікі і вырабаў медыцынскага прызначэння.

Акрамя таго, затрыманы шэраг службовых асоб «Белмедтэхнікі», якія ўдзельнічалі ў арганізацыі работы камісіі Міністэрства аховы здароўя па закупцы абсталявання і забеспячэнні своечасовай аплаты паставак. «За ўчыненне злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 430 «Атрыманне хабару», 431 «Дача хабару» і 243 «Ухіленне ад выплаты сум падаткаў, збораў» КК затрыманы, узяты пад варту, а таксама прыменены іншыя меры стрымання ў адносінах да 33 службовых асоб, а ўсяго — больш за 50 чалавек. Фактычна ўсе яны віну прызналі, супрацоўнічаюць са следствам», — расказаў Валерый Вакульчык.

Службовыя асобы сістэмы аховы здароўя атрымлівалі хабар за вырашэнне пытанняў, якія ўваходзілі ў іх кампетэнцыю. Разавыя незаконныя ўзнагароды даходзілі да $10 тыс., а асобным службовым асобам — да $350 тыс. за раз. Шэраг фігурантаў паспрабавалі схавацца, у тым ліку за мяжой, што паскорыла вырашэнне пытання аб іх затрыманні і арышце.

Старшыня КДБ падкрэсліў, што размова ідзе аб чыноўніках, у функцыянальныя абавязкі якіх уваходзіла прыняцце рашэнняў аб закупцы медыцынскага абсталявання і лякарстваў, а не аб лечачых урачах сістэмы аховы здароўя краіны.

Валерый Вакульчык нагадаў, што кіраўнік дзяржавы даў даручэнне ўраду знізіць кошт лякарстваў. «Пры гэтым, што па зразумелых прычынах засталося за кадрам, Камітэту дзяржаўнай бяспекі было даручана глыбока і ўсебакова разабрацца ў прычынах завышэння кошту лякарстваў і медыцынскага абсталявання. Гэта работа камітэтам была праведзена. У медыцынскай сферы выкрыты сістэмныя карупцыйныя праявы. Устаноўлена, што кошт і лякарстваў, і абсталявання завышаўся на 10—60 працэнтаў, у асобных выпадках на 100 працэнтаў», — сказаў старшыня КДБ.

Злачынныя схемы, якімі скарысталіся пастаўшчыкі медыцынскага абсталявання і лякарстваў, у тым ліку па ўхіленні ад выплаты падаткаў, прадугледжвалі вывад звышпрыбыткаў у выглядзе незаконна атрыманых грашовых сродкаў на рахункі юрыдычных асоб у ПАР, Ганконгу (КНР), Літве, Латвіі, Расіі і іншых краінах.

«З іх на хабары без перабольшання ішлі мільёны долараў ЗША. У выніку вобыскаў, добраахвотнага кампенсавання ўрону, вяртання незаконна атрыманых сродкаў у даход дзяржавы паступіла ўжо больш за $15 млн. Аператыўна-вышуковыя і следчыя дзеянні прадаўжаюцца», — адзначыў Валерый Вакульчык.

«Фактычна механізм допуску лякарстваў і медабсталявання на рынак краіны быў настолькі забюракратызаваны, што хаджэнне па кабінетах медыцынскіх чыноўнікаў і валакіта займалі месяцы і нават даўжэй. Як вынік, медустановы не маглі своечасова атрымаць патрэбнае абсталяванне або запчасткі да яго. Такім чынам, устаноўлена, што фактычна існуючая сістэма закупак медыцынскага абсталявання і лякарстваў стварала ўмовы для карупцыйных праяў», — канстатаваў старшыня КДБ.

У КДБ падкрэсліваюць, што выкрытыя факты праціпраўнай дзейнасці ў сістэме аховы здароўя дадуць магчымасць ацаніць рэальны стан спраў па закупках лякарстваў і медыцынскага абсталявання, будуць садзейнічаць зніжэнню іх кошту і эфектыўнаму выкарыстанню бюджэтных сродкаў, якія выдзяляюцца дзяржавай на такія патрэбы. Гэта таксама дапаможа выключыць прычыны і ўмовы для карупцыйных праяў, пасадзейнічае стварэнню празрыстага і роўнага механізма набыцця лякарстваў і медыцынскага абсталявання. З пункту гледжання вядзення бізнесу гэта будзе выгадна як добрасумленным пастаўшчыкам, так і дзяржаве, а таксама насельніцтву Беларусі. «Для любога прафесіянала і нават непрафесіянала відавочна, што размова ідзе не пра разавыя мерапрыемствы, не пра біцце па хвастах, а пра глыбокую сістэмную мэтанакіраваную работу па спыненні карупцыі ў нашай краіне», — рэзюмаваў Валерый Вакульчык.

**БелТА** ■